произведений на мультимедийный экран, который был размещен на сцене, проецировались шедевры иконописи, раскрывающие смысл песнопений. Конферансье концерта А.Золотов во время концерта рассказывал о смысле Великого поста и канонах богослужения Страстной седмицы, особенностях творчества исполняемых композиторов [3]. Данный проект свидетельствует о том, что современная художественная культура переживает радикальные трансформации, к числу которых относится динамическое переопределение роли церковного искусства в обществе, новые формы отношений между сферами религиозного и светского. В картине мира, предлагаемой массовой культурой, находится место всему, в том числе и интересу к религии. При этом, следует отметить, что развлекательный характер современной «религиозности» не означает, что она не оказывает достаточного влияния на личность, культуру и общество, напротив, это влияние тем сильнее, чем сильнее ее связь с массовой зрелищной культурой.

Сегодня практика проведения концертов изобилует колоритным видеорядом, слайд-презентациями, видеопроекциями, иллюстрациями с титрами, сопровождающими выступления чтецов, вокалистов, музыкантов, актеров и танцовщиков. Расширяясь в масштабах и разрабатывая новые стратегии развлечения, медиа вырабатывают мощные механизмы воздействия на аудиторию. Манипулирование, игра визуальными образами особенно привлекает детского зрителя, позволяет ему находиться в зоне эстетического комфорта, сильного эмоционального напряжения.

Практика создания мультимедийных спектаклей для детей имеет яркие примеры и в Беларуси. Так, в 2015 г. в Белорусской государственной филармонии был показан уже ставший популярным в Европе мультимедийный спектакль «Икар на краю времени». Впервые в постановочной практике Беларуси была выбрана форма мультимедийного спектакля. В данном проекте сюжет книги о комических путешествиях, пересекающих временные и пространственные границы был воплощен с помощью звучания симфонического оркестра, видеофильма (режиссеры А.Холмис, А.Тейлор) и текста в исполнении чтеца (актер, телеведущий Д.Кохно) [4]. Синтез искусств, удачно воплощенный в данном проекте, способствует актуализации новых форм искусства для детей.

Не менее актуальна и выбранная тема – космическое путешествие к черной дыре, неизведанность категории времени. Сложная для детского восприятия тема, касающаяся теории относительности, обретая визуальную и аудиальную форму, создает впечатляющий мир фантазий, приключений, близкий для ребенка. Авторы данного арт-проекта для большей доступности сложной научной проблемы пригласили выступить со вступительным словом фундаментального ученого, члена Национальной академии наук Беларуси, занимающегося вопросами теоретической физики Л.М.Томильчика. Тема выступления была продолжена в эпиграфе концерта – пьеса «Юпитер» из сюиты «Планеты» для большого симфонического оркестра Г.Холста [4].

Мультимедийный спектакль предполагает взаимодействие различных видов искусств. В проекте исполнялась специально написанная музыка, иллюстрирующая все перипетии сюжета, озвученного чтецом. Для лучшего понимания и визуализации литературного текста на экране проецировалось видео, сочетающее возможности монтажа, крупные кадры главного героя, панорамные виды космического пространства. Наиболее завораживающее зрелище представляет собой иллюстрация черной дыры, поглощающей материю. Стремительные пассажи скрипок в музыке, напоминающие волновые излучения дополняют картину космического пространства.

Несмотря на сложность поднимаемой проблемы для детской аудитории близок сюжет спектакля. Он является переложением классического мифа об Икаре, но главный герой использует не перьевые крылья, а современный космический корабль. Осваивает он не далекое Солнце, а таинственную черную дыру. Захватывающий сюжет, форма мультимедийного спектакля позволяют использовать возможности синтеза различных видов искусств, что, в свою очередь, позволяет создать арт-проект актуальный для различных возрастных групп. Для школьного возраста наиболее интересными являются факты об основах теории относительности, для подросткового возраста актуально использование различных визуальных эффектов видео-контента, музыкальные приемы звукоизобразительности, создающие порой эффект полного погружения в другую реальность.

Мировая премьера мультимедийного спектакля по книге-бестселлеру Б.Грина «Икар на краю времени» с музыкой знаменитого композитора Ф.Гласса состоялась в 2010 г. на «World Science Festival» в Нью-Йорке. Позже этот проект был показан в Дублине в рамках программы «Dublin City of Science» в 2012 г. В российской постановочной практике этот мультимедийный спектакль был впервые показан в 2013 г. в рамках фестиваля «Политех» в Москве. Современное прочтение мифа об Икаре было представлено в пространстве павильона «Космос» Всероссийского выставочного комплекса. Закадровый текст читал актер С.Девонин, музыкальный компонент прозвучал в исполнении Юношеского симфонического оркестра России им. Л.Николаева под управлением Василия Валитова.

Как отмечают исследователи, вмешательство медиатехнологий в сферу академического искусства было мощным, быстрым и разнообразным. И как следствие, академические концерты, спектакли шли по пути поиска новых подходов и форм для разговора об искусстве со зрителем средствами медиатехнологий. Это повлекло необратимые изменения в художественной культуре и психологии восприятия искусства новым поколением зрителя. Исполнители в современных реалиях все чаще делают акцент на зрелищной стороне своих выступлений, используют возможности медиатехнологий, и тем самым актуализируют новые сценические формы своих выступлений.

**Список литературы:**


1. Астафьева, Т.В. Компьютерные и медийные технологии в сценографии как фактор развития постановочного процесса / Т.В. Астафьева // Общество. Среда. Развитие. – 2011. – № 3 (20). – С. 128-133.
2. Астафьева, Т.В. Новые технологии в современном постановочном процессе / Т.В. Астафьева // Современное искусство в контексте глобализации: наука, образование, художественный рынок : матер. III Всерос. науч.-практ. конф., Санкт-Петербург, 29 января 2010 г. – СПб. : ГУП, 2010. – С. 136-137.
3. Информационный портал РИА-новости [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://ria.ru/20120419/630757141.html. – Дата доступа: 16.04.2019
4. Официальный сайт Белорусской государственной филармонии. –[Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://philharmonic.by/by/concert/otkrytie-sezona-multimediynyy-spektakl-dlya-detey-ikar-na-krayu-vremeni. – Дата доступа: 16.04.2019
5. Юдина, Е.Н. Развитие медиапространства современной России : дис. …докт. социолог. наук : 22.00.04 / Е.Н. Юдина; Московский гос. пед ун-т. – М., 2008. – 363 с.



***Жанна Ачыновіч***


**ЭСТЭТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ НАВУЧЭНЦАЎ ЦЭНТРА ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ПРАЗ ДАЛУЧЭННЕ ІХ ДА СЯМЕЙНЫХ АБРАДАЎ І ТРАДЫЦЫЙ** *(на матэрыялах вяселля Клічаўскага раёна)*


*У артыкуле распавядаецца аб традыцыйным вяселлі Клічаўскага раёна, а таксама ўдзеле навучэнцаў этнаграфічнага аб'яднання па інтарэсах «Гарэзы» у вывучэнні і рэканструкцыі элементаў вясельнага абраду па матэрыялах этнаграфічных экспедыцый.*





РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Zhanna Achynovich***

**PUPILS AESTHETIC EDUCATION OF THE CONTINUING EDUCATION CENTER BY BRINGING THEM TO THE FAMILY RITUALS AND TRADITIONS** *(based on Klichau district wedding materials)*

*The article tells about the traditional wedding in Klichau area, as well as the participation of "Hareza" ethnographic association of students. "Hareza" members are interested in the study and reconstruction of the wedding ceremony elements based on ethnographic expeditions.*

Вяселле – вельмі важная і запамінальная падзея ў кожнай сям'і. Калі распытаць сваіх бабуль, суседзяў, знаёмых, то можна даведацца шмат чаго вельмі цікавага пра тое, як праводзіліся вяселлі ў іх часы. Старыя людзі памятаюць, як гулялі вяселлі ў часы іх бабуль. У многіх альбомах, як сямейная рэліквія, зберагаюцца вясельныя фотаздымкі. Вяселле ахоплівае ўсіх членаў сям'і, пачынаючы ад самых старэйшых да самых малодшых. Гэта такая падзея, якую вельмі чакаюць. На яе таксама збіраюцца паглядзець людзі, якія не прымаюць удзел у вяселлі. На занятках нашага аб'яднання па інтарэсах «Гарэзы» Клічаўскага Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі вучні вывучалі матэрыялы аб абрадах і традыцыях нашага Клічаўскага раёна, і вырашылі астанавіцца на вяселлях, больш падрабязна вывучыць іх і паспрабаваць зрабіць невялічкую рэканструкцыю некаторых вясельных элементаў.

Самы першы матэрыял, які трапіў нам у рукі – запіс вясельнага абраду з вёскі Стары Вастраў. Гэты абрад запісала былая настаўніца Любчык Зінаіда Мікалаеўна ад жыхаркі Кубар Вольгі Васільеўны 1901 года нараджэння. Калі ў 2011 годзе праводзіліся экспедыцыі РМГА «СЭТ» у нашым раёне, гэты матэрыял быў перададзены ў архіў. На вялікі жаль, са слоў Любчык З.М. поўны запіс вясельнага абраду знік, але захавалася крыху сабранага матэрыялу, з якога можна было даведацца, што вяселлі былі розных відаў: звычайнае, прымацкае, сіроцкае, удавецкае. У залежнасці ад гэтага выконваліся пэўныя абрады і песні. «…Удава не мела права адзець вянок. Прымацкае вяселле звычайна гулялі у хаце маладой. Сірата хадзіла раніцай у нядзелю на могілкі звацъ памершых бацькоў на вяселле. На вяселлі ёй спявалі шмат сіроцкіх песен … Госці і ўсе прысутныя благаслаўлялі маладую сесці «на пасад» – на дзяжу». З вясельных чыноў вядома, што былі старэйшы сват, дружкі, сташкі, стараста – гэта ў дружыне маладога. У дружыне маладой – браты, дружкі. На вялікі жаль, не захаваліся назвы ўсіх вясельных чыноў і якую ролю яны выконвалі на вяселлі. Усе дзеянні суправаджаліся песнямі, пачынаючы ад таго, як маладога выпраўлялі да маладой. Фурманкі упрыгожвалі кветкамі, вешалі бомы(званкі), ручнікі каля дуг. «...Маладых садзілі за стол, абсыпалі збожжам, хмелем. Дзяўчаты і жанчыны з усёй вёскі прыходзілі паглядзець на маладых і паспяваць…» Спявалі песні ўсім прысутным. Жартоўныя песні спявалі сватам: «… Ой, свату наш свату, да пусці нас у хату…» . «Ой, едкі сваты едкі, цэлага вала з'елі…»«... Дзяўчаты заводзілі маладую у камору, каб памераць жаночы галаўны убор. Валасы завівалі, адзявалі чапец, накрывалі накіткай або хусткай, звалі жаніха, каб пазнаў маладую сярод жанчын. У любы час вяселля маглі украсці маладую. Жаніх павінен быў знайсці яе і выкупіць…»

На вяселлі адбывалася дзяльба каравая. Маладым дарылі розныя падарункі, таксама і сімвалічныя дары, «…гаварылі дасціпныя жарты, напрыклад «Дару пяток медзі, каб былі дзеці, як мядзведзі», «Дару дзве цыбулі, каб не паказвалі адзін аднаму дулі». Вельмі кранальным момантам было, калі нявеста развітвалася са сваімі роднымі, сяброўкамі, суседзямі і знаёмымі, з кожным з іх яна цалавалася і канечне, гэта было ў суправаджэнні песен. «Ступіла Манечка з лаўкі далоў, пакланілася татку з мамкай да ног». Гэтыя песні ўзятыя з архіву СЭТ. Запісаны ад Кунцэвіч Надзеі Фёдараўны і Казачонак Надзеі Фёдараўны, жыхарак вёскі Стары Вастраў.«…Заходзячы у хату, маладая сыпала жытам і цукеркамі ва ўсе куткі, у хлеў несла кавалак сыру, на студню вешала пояс, каб усюды вялося добра. Жанчына ад маладой вешала на абразы ручнікі, засцілала сталы абрусам…»

У вёсцы Дзмітраўка быў запісаны вялікі матэрыял па вяселлю таксама сябрамі «СЭТ», пачынаючы ад сватаўства і скончваючы другім днём вяселля ад Кавалёнак Соф'і Іванаўны (1934), Дрэнь Анастасіі Мікалаеўны, (1932),Кунцэвіч Соф'я Іванаўна (1934). Гэты матэрыял мы вывучалі па аудыёзапісах, уважліва праслухоўвалі, развучвалі песні. Са слоў інфармантаў гэта адбывалася так: «…У дзень вяселля нявесту упрыгожвалі сяброўкі ў хаце суседзяў, якія жылі па тым жа баку вуліцы. Вянок рабілі з марлі, плавілі воск, кроплі застывалі, потым іх размалёўвалі і упрыгожвалі вянок, таксама кветкамі з паперы і рознакаляровымі стужкамі…» Брат нявесты вёў яе на пасад. Гаварылі такія словы «Дзе твой, Настачка, брат, хай вядзе цябе на пасад». Спявалі песню: «Брат сястру на пасад вядзе,гібкую кладку кладзе…». На лаўку засцілалі аўчыну (кажух). Нявеста на яе садзілася. Потым, як нявеста крыху пасядзела, аўчыну кралі маладыя дзеўкі і кідалі на страху, або плот, каб выйсці замуж, а хлопцы адбіралі, каб не кідалі, так атрымлівалася гульня паміж хлопцамі і дзяўчатамі.

Ехалі потым у шлюб на конях. Калі ехалі у шлюб, пелі песню: «Ні рана на дварэ, ні рана. Поўна тых конікаў нагнана…» Пасля шлюбу маладыя едуць у хату к маладой. Госці садзяцца за стол, а маладыя стаяць у дзвярах. Маці хросная сустракае з хлебам. Потым хто – небудзь гаворыць: «Ці ё у гэтай хаце родныя бацька і маці гэтаму дзіцяці? Так жа сама хросныя, каторыя к Хрысту паднасілі, шчасця і долі сваёй хрэсніцы прасілі. Ад скута да печка прашу кожнага чалавечка – госцейкі, прыезджыя, саседзі прыгожыя, музікі вясёлыя і ўвесь мір хрышчоны разрашыць маладых у хату весці. - Можна! (Ёсць варыянт, што усё такі гаварылі «Бог благаслявіць»). - Разрашылі у хату весці, разрашыць на пасад сесці за дубовыя столікі, за шаўковы абрусікі, за горкія чары, за божыя дары. -Можна! - Разрашылі у хату весці, разрашылі на пасад сесці за дубовыя столікі, за шаўковы абрусікі, за горкія чары, за Божыя дары. Бог благаславіў. Як на гэты свет нарадзіўся чалавек. А табе маці нізкі паклон ад свайго дзіцяці. Маладая ўходзя ў хату, кланяецца маці, бацьку і ўсе садзяцца за стол. Потым, як пагуляюць, малады забірае маладую к сабе ў хату. Калі жаніх забіраў нявесту, дружкі пыталіся: «Настачка, куды ты?» Яна адказвала: «У свет, і вы за мною ўслед». «…Дарогу перагаражвалі. Ставілі хлеб, соль, вядро вады, каб было поўна. Калі не хочуць даваць гарэлкі, то на свата ці на каго выліваюць гэта вядро вады…»

Адорвалі на другі дзень. Хросная матка дзяліла каравай, а хросны бацька даваў і чарку наліваў. Каравай давалі у платочак. Спачатку дарылі бацькі, блізкая радня, потым суседзі, сяброўкі і сябры. На другі дзень маладой трэба было, рана устаўшы, падмесці хату, бо калі ёй загадае хто – небудзь памесці хату, то жаніху трэба плаціць грошы. Таксама было шмат розных вясельных жартаў, пераапрананняў.

У вёсцы Тачышча ад носьбітаў Ганчарык Марыі Васіл'еўны і Харлап Аляксандры Паўлаўны было запісана некалькі вясельных песен. Як едзе малады к маладой: «Ў дарогу сваты, ў дарогу, да бярыця ж Бога з сабою…». Гэту песню спявалі таксама, калі матка збірала сына за нявесткай: «Ні забудзь, Іванька, ні забудзь, што табе мамачка казала, як на коніка саджала…»

Са слоў Аляксандры Паўлаўны, як яе маладую прывезлі ў хату жаніха. «…Як мяне устрачалі, то дзяжу выносілі. Тую дзяжу, у якой хлеб пяклі. Я вышывала пакрышку на дзяжу з махрамы. Накрывалі ету дзежку. Прыехалі, у каня дуга прыбраная, званок звініць. Прыйшла дзядзіна, Ну, што ж,маладуха, злажай. Ужо прыехала дамоў». «Я злажаць не буду, прынясіце мне дзяжу.» І мелач брала з сабой. Прынеслі дзяжу, паставілі. Я разаслала на дзяжу пакрышку, сыпанула мелач і стала, пастаяла, яны мяне знялі.»Вот цяпер, кажу, я пайду дамоў». Злезла здзяжы, пашла рассупоніла каня. Нада рассупоніваць, каб было легчэ дзяцей раджаць. Я каня рассупоніла, як

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пусціла дугу з цвятамі. Патом зашлі у хату, первая, вышытую скацерку заслала на стол і павесіла на іконы два рушнікі…» На дзяжу магла стаць толькі цнатлівая дзяўчына. Таму было для нявесты вялікая чэсць, калі б усе ўбачылі, што яна зберагла сваю дзявоцкасць да шлюбу.

Тацяна Іванаўна Лукіна 1940 года народжання з вёскі Калічонка таксама крыху распавяла нам пра вяселле. Ад яе мной была запісана песня, як маладую вялі на пасад : «Ой, ліцяць, ліцяць два саколікі цераз стан. Ой, вядуць, вядуць красну Леначку на пасад…» . Таксама песня, якая спявалася ў Зборную сботу і калі маці дачку выпраўляла ў хату маладога «Куды мяне, мамачка, аддасі, хоць на скацерцы напішы…» На вяселлі ў Калічонцы прыбіралі елачку. Са слоў Тацяны Іванаўны «… перад свадзьбай у нявесты ўбіралі елачку. Вешалі ленты, стужкі. Убіраюць падружкі і прачуць, штоб ніхто ні бачыў. А кагда ідуць вячэрнікі к маладому , прыносюць эту елку на стол. Ну ужэ выпоюць тут (у маладой) і пашлі к маладому. Неслі ёлку з песнямі…». Таксама запісалі ад яе і анекдот: «…Стаіць бабка. Ідзець маладая із сумачкай. А іна спрашая -Дзіцятка маё, куда ты йдзеш? - Бабка, замуж – Дзіцятка маё, а раншэ ж замуж ішлі дак вязлі сундук і падушкі, а ты з адной сумачкай? – Бабка, раншэ ішлі на ўсю жызню, а я толькі на адну ноч».

Падрабязна вывучыўшы матэрыял, мы правялі занятак па вырабу вясельных свечак і заняткі па вырабу вясельнага вянка для маладой. Выбралі кожнаму ролі. Малады і маладая, шафер і шаферка, брат маладой, госці былі з ліку навучэнцаў этнаграфічнага аб'яднання па інтарэсах «Гарэзы», вакальнага аб'яднання «Менестрэль». Канечне, на ролі маладых і дружак выбіралі старэшых навучэнцаў, якія самі выказалі пажаданне «пагуляць у вяселле». Узрост ўсіх нашых навучэнцаў вагаўся ад 11 да 18 гадоў. Падтрымалі нас педагагічныя работнікі, метадысты Цэнтра, запрасілі мы таксама носьбітаў абраду і бацькоў. Так як песні дзеці на вяселлях не спявалі, то іх выконвалі носьбіты. У дарослых былі таксама вельмі важныя ролі – бацькі і хросныя бацькі, сваты, каравайніцы, дарослыя прадстаўнікі роду маладога і роду маладой. Распрацавалі сцэнарый, вывучылі фрагменты вяселля, папрасілі касцюмы ва установах культуры раёна і таксама з калекцыі тэатра мод «Цукеркі»«Спадчына» ДУДА «КЦДАДіМ».

Вырашылі для правядзення рэканструкцыі выкарыстаць былы будынак сельскай школы вёскі Усакіна. Упрыгожылі ўнутры ў стылі сельскай хаты. У дзень, які мы па плану выбралі, каб правесці сваё мерапрыемства, надвор'е было не надта добрым. Марасіў дождж. А нас чакалі вясельныя фурманкі і жыхары вёскі Усакіна, якія думалі трапіць на сапраўднае вяселле, з сапраўднымі маладымі, гасцямі, і пачастункамі. Прыехалі, прыбралі коніка і пачаліся здымкі. Было вельмі цікава, часамі смешна. Асабліва спачатку, калі на коніках «маладых», не зразумеўшы, што патрэбна зрабіць толькі невялічкі круг па вуліцы, павезлі на Мемарыяльны комплекс «Усакіна» ускладваць кветкі да помніка. Сустракалі «маладых», як і патрэбна з бацькамі, хроснымі. «Маладая» станавілася на дзяжу, сыпала мелкія капейкі. «Малодшы брат» вёў сястру на Пасад, садзілі на кажух, благаслаўлялі свечкамі, выносілі каравай з песнямі і музыкай, частаваліся, танцавалі традыцыйныя танцы. Канечне, крыху выйшла непаразуменне з жыхарамі вёскі, якія, не дачакаўшыся пачастункаў, пайшлі дадому, так і не ўсвядоміўшы, што вяселле не сапраўднае. Гэта гаворыць аб тым, што рэканструкцыя прайшла паспяхова.

Пасля таго, як праглядвалі здымкі і відэазапіс, было вырашана гэтым летам усё перазняць, зрабіць больш падрабязна, пачынаючы з таго дня, калі ідуць у сваты. Здымаць часткамі, добра прадумаць адзенне і знайсці больш падыходзячую для вяселля хату. Запрасіць прафесіянала фатографа, каб здымаў і фота і відэа. Дарослым і навучэнцам вельмі спадабалася удзельнічаць у гэтым мерапрыемстве. Старэйшыя хлопцы прапанавалі нават правесці эксперымент – патанцаваць Мікіту праз палкі пад сучасную музыку. Зараз яны згодны і песні спяваць, і танцаваць, і прымаць удзел у любых іншых праектах Цэнтра дадатковай адукацыі.

**Спіс літаратуры:**


1. Вяселле, песні / Акадэмія Навук Беларускай ССР, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – Кніга 4. – 420 с.
2. Котович, О. Белорусская свадьба – тайные ключи семейного счастья / О. Котович, Я. Крук. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2011. – 320 с.
3. Беларускія народныя песні са зборнікаў В. П. Шэйна / склад. К. Кабашнікаў ; камент. : Г. Барташэвіч, К. Кабашнікава. – Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, Рэдакцыя мастацкай літаратуры, 1962. – 429 с.
4. Никольский, Н. М. «Происхождение и история белорусской свадебной обрядности / Н. М. Никольский. – Минск : Изд-во Академии наук БССР, 1956. – 277 с.



***Дмитрий Косьяненко***


## СПЕЦИФИКА ГРИМА В СОЗДАНИИ СКАЗОЧНЫХ ПЕРСОНАЖЕЙ АКТЕРА Г.Ф. МИЛЛЯРА


***Dmitriy Kosyanenko***


## THE SPECIFICS OF GRIM IN CREATING FAIRY CHARACTERS OF ACTOR G. F. MILLAR


*Автор статьи рассматривает характерные особенности кинематографического грима. Выявляет основные технологии и материалы гримировального искусства, способствовавшие созданию сказочных образов Г.Ф.Милляра.*

*The author of the article considers the characteristic features of cinematic make-up. Reveals the basic technologies and materials of make-up art that contributed to the creation of fabulous images of G. F. Millar.*


«Я работаю в области сказок»
Г.Ф. Милляр

Сказка – это произведение народного фольклора, созданное для развлечения и воспитания ребенка. Персонажи сказок несут свое послание в символической, образной форме, из их уст звучат нравоучения, размышления о вечных вопросах существования человека – любви и ненависти, подлости и благородстве, предательстве и верности, трусости и отваге. Удивительный мир сказки способен воплотить любую мечту в фантазию, чудо в волшебство, реальность в вымысел.

Георгий Францевич Милляр родился в 1903 г. В Москве в знатной семье французского инженера Франца де Милье и дочери сибирского золотопромышленника Елизаветы Журавлевой. Благодаря состоятельным родителям мальчик в детстве получил прекрасное образование, был обучен языкам, музыке, живописи. Наставничество родной тети привила мальчику любовь к театральному искусству.

Начало творческого пути актера Г.Ф. Милляра было связанно именно с театром, где он исполнил свою первую роль Золушки (1920). После окончания актерской школы при Московском театре революции Г.Ф. Милляр исполнил множество ролей завоевав славу характерного актера: аптекарь (Уильям Шекспир. «Ромео и Джульета»), атташе (Гомин Лесь. «Голгофа»), граф Людовико (Лопе де Вега. «Собака на сене»).




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ